# Абуджаць любоў да Радзімы



**Мэтанакіраваная, яркая і энергічная Міхайліна Хвясюк — уладальніца трох спецыяльных прэмій фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, трохразовая пераможца Хіт-параду Нацыянальнага радыё Рэспублікі Беларусь, а таксама прызёр Нацыянальнага Хіт-параду "Наперад у мінулае". Абуджаць музыкай у сэрцах людзей любоў да Радзімы — так бачыць сваё прызначэнне наша гераіня, якая ўпэўнена ідзе да ўвасаблення творчых задум.**

**— Міхайліна, калі пачаўся ваш творчы шлях?**

— Спевы — мая любоў з трох гадоў. Менавіта тады я ўпершыню выйшла на сцэну ў складзе вакальнага ансамбля "Лялькі". Бацькі адразу разгледзелі маю артыстычную натуру і цягу да творчасці. З мноства дзіцячых захапленняў, якія мне прапаноўвалі ў розных секцыях і гуртках, я безагаворачна выбрала свет спеваў.

**— З таго часу вы яскрава праявілі сябе на такіх маштабных пляцоўках, як, напрыклад, "Славянскі базар у Віцебску". Якім чынам складвалася дарога да вялікай сцэны?**

— Пунктам адліку можна лічыць паспяховае выступленне на дзіцячым вакальным конкурсе ў родных Мікашэвічах. Мой нумар тады прынялі на ўра — і паклікалі на першы вялікі канцэрт, што быў прысвечаны Дню горада. Яшчэ большы размах мая канцэртная дзейнасць набыла пасля леташняга паступлення ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, аб якім я здаўна марыла.

**— Што вас натхняе на актыўныя выступленні?**

— Энергія ніколі не згасае, калі ты займаешся любімай справай! Сцэна — маё месца сілы, мой другі дом, і я кожны раз з велізарным задавальненнем выходжу на яе, каб дарыць людзям пазітыўныя эмоцыі і ўсмешкі.

**— На каго з музыкантаў раўняецеся?**

— На сваю настаўніцу, заслужаную артыстку Рэспублікі Беларусь Ірыну Дарафееву, педагагічныя і пеўчыя таленты якой выклікаюць глыбокую павагу.

**— Раскажыце, калі ласка, пра свой рэпертуар.**

— Я — аўтар-выканаўца, і творчасць мая прасякнута любоўю да Беларусі. У мяне нямала песень, прысвечаных нашай краіне, яе гісторыі і народу. Імкнуся ствараць музыку, якая будзе спалучаць глыбокія пачуцці і сучаснае гучанне, каб знаходзіць водгук у сэрцах маладых слухачоў. І, як бачна, мне гэта ўдаецца!

**— Які шлях праадольвае песня, перад тым як дайсці да слухача?**

— Спачатку кампазіцыя праходзіць "сямейны тэст-драйв". Я паказваю яе родным, слухаю, што яны скажуць: падабаецца ці не. Толькі пасля гэтага, калі ўсё добра, твор выходзіць у свет. Але бывае, што я не магу ўтрымацца і паказваю ўрыўкі новых песень у сацыяльных сетках, нават калі яшчэ не пройдзены першы, "сямейны" этап.

**— Нечым парадуеце нас бліжэйшым часам?**

— Ужо зусім хутка планую выпусціць песню "Карані" на беларускай мове. Гэты твор, што расказвае пра вытокі беларускага народа і раскрывае глыбіню яго гісторыі, ужо паспеў стаць сапраўдным хітом сярод моладзі.

**— Як гэта адбылося?**

— Напярэдадні Дня Незалежнасці разам з БРСМ запусцілі флэшмоб "Мы — дзеці адзінай святой Беларусі". Пад урывак з песні "Карані", які знаходзіўся ў агульным доступе, хлопцы і дзяўчаты з усіх куткоў краіны з энтузіязмам дзяліліся тым, што для іх значыць родная зямля, паказвалі яе непаўторную прыгажосць. Усяго за суткі маладыя беларусы апублікавалі больш за 200 такіх відэа, якія разляцеліся па ўсіх сацыяльных сетках!

**— У вашай скарбонцы дасягненняў — тры спецыяльныя прэміі фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі...**

— Першую заваявала ў 2019-м дзякуючы перамозе ў V Міжнародным конкурсе "Мінск. Скрыжаванні", другую — у 2020-м праз гран-пры Міжнароднага фестывалю-конкурсу "Новыя Вяршыні". А цяпер стыпендыю прынёс XII Рэспубліканскі творчы радыёконкурс "Маладыя таленты Беларусі".

**— Якія пачуцці ўзнікаюць, калі здабываеце такія прэстыжныя ўзнагароды?**

— Я прыкладала мноства намаганняў, каб атрымаць гэтыя прэміі, і кожны раз, калі ўсё атрымлівалася, мяне накрывала хваля станоўчых эмоцый.

**— Самыя яркія праекты і падзеі, у якіх удалося паўдзельнічаць апошнім часам, — гэта...**

— Безумоўна, XXXIV Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску", канцэрт у гонар Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і Рэспубліканскі выпускны.

**— А ці бачыце сябе ў педагогіцы? Мо ўжо быў такі досвед?**

— Не раз выступала ў ролі настаўніка для малодшай сястры. Яна таксама спявачка, і я напісала для яе некалькі песень, а яшчэ дала каштоўныя парады адносна развіцця музычнай кар'еры на аснове асабістага вопыту.

**— Што ў планах на будучае?**

— Цяпер з галавой пагрузілася ў працу над новай песняй. На гэты раз вырашыла выйсці за рамкі звыклага і паэксперыментаваць. Думаю, неўзабаве прадстаўлю вынікі сваіх творчых пошукаў публіцы.

Наогул мае амбіцыі распасціраюцца ад правядзення сольнага канцэрта да дасягнення статусу народнай артысткі Беларусі пасля атрымання дыплома. Самае важнае — гэта ўнутраны агонь, вера ў свае сілы, смеласць марыць, настойлівасць у дасягненні ідэалаў і шчыры запал да справы. Спадзяюся, што ўсё збудзецца!

**— Што параіце маладым выканаўцам, якія імкнуцца выйсці на буйныя пляцоўкі?**

— Не сядзіце на месцы, стукайце ва ўсе дзверы, даследуйце разнастайныя шляхі развіцця, заставайцеся адданымі сваёй справе — і тады праца будзе ўзнагароджана. Вас абавязкова заўважаць і па заслугах ацэняць!

Віялета ГРЫНКЕВІЧ
Фота з архіва гераіні